## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении 10 мая 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (местонахождение, наименование, характеристики продаваемого имущества)** | Расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Набережная, 8, «здание хозяйственно-бытовое» общей площадью 94,5 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-39667; составные части и принадлежности: целое одноэтажное кирпичное здание котельной В 1/к с двумя кирпичными пристройками Г1/к, 1); расположенные по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, «артезианская скважина» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-40402; составные части и принадлежности: артезианская скважина 1.Г, состоящая из колодца над артезианской скважиной 1.1 г1, асфальтобетонной площадки 1.2 г2, ограждения 1.3 г3); «железнодорожный тупик на прирельсовой базе» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42933; составные части и принадлежности: железнодорожный тупик на прирельсовой базе протяженностью 109,0 м; «мазутохранилище на 180 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42791; составные части и принадлежности: кирпично-железобетонное мазутохранилище 1.Б с тамбуром технологическим 1.1 б1); «мазутохранилище на 180 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42792; составные части и принадлежности: металлическое мазутохранилище 1.А, с тамбуром технологическим 1.1 а1); «битумохранилище на 750 тонн» (инв. номер в ЕГРНИ 622/С-42793; составные части и принадлежности: железобетонное битумохранилище на 750 т 1.В, с тамбуром технологическим 1.1 в1); забор сетка-рабица (инв. № бухг. 100130) |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 625450100001003819, площадь – 0,5249 га; назначение: для содержания и обслуживания прирельсовой базы |
| **Сведения о продавце** | ОАО «ДСТ №7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, т. (8017) 507-61-83 |
| **Сведения об организаторе торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, т. (017) 327-05-62 |
| **Начальная цена предмета торгов (снижена на 40 процентов)** | 87 311,59 бел. руб. с учетом НДС |
| **Размер задатка** | 8 700,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 10 мая 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.04.2017 по 05.05.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(029) 690-75-54 (ОАО «ДСТ №7»).**

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс**

## «ОЛИМПИЙСКИЙ»

**проводит аукцион №119 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года**

| Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | | Площадь, м² | Начальная цена продажи |
|---|---|---|---|
| **г. Минск, пр-т Независимости, 51, пом. 1** | | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение №1 на 3 этаже (под офис) | 336,0 | 1276,80 |
| **г. Минск, ул. Сурганова, 2** | | | |
| 2 | Изолированное нежилое помещение №66 и часть коридора № 65 на 2 этаже (под офис) | 13,9 | 52,82 |

**Аукцион состоится 12 мая 2017 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по 11 мая 2017 года до 15.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.**

**Интернет: www.dvs.by**

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101508270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.


# ПАЧАСТУЙЦЕСЯ ЛАЗНЯЙ!


Фота Надзеі БУЖАН.

**У мінулую суботу ў сталічным Палацы спорту прайшлі незвычайныя для Беларусі спаборніцтвы — першы рэспубліканскі чэмпіянат па паранні ў лазні. Дванаццаць чалавек з'ехаліся, каб высветліць, хто ж лепш за ўсіх валодае майстэрствам лазневага парыльшчыка. Паназіраць за гэтым займальным працэсам мог любы ахвотны — спецыяльная кабіна была ўсталявана проста ў выставачнай зале. Перамогу святкаваў жыхар Мінска Арнольд Пятроў. Якому, між іншым, споўнілася 70 гадоў!**

Арнольд Афонавіч мае лазневы «стаж» больш чым у паўстагоддзя. Па адукацыі ён — інжынер. У савецкія часы працаваў у абароннай прамысловасці. Дзякуючы гэтаму аб'ездзіў усю вялікую краіну. І кожны раз імкнуўся наведаць лазню.

— Сібір, Поўнач, Закаўказзе — дзе мы толькі ні парыліся. І ва ўсіх мясцовасцях лазні адрозніваюцца адна ад адной, часам моцна. Напрыклад, лазня ў Краснаярску зусім не падобная на беларускую. Яна нават пабудавана па-іншаму. У Варкуце, напрыклад, у лазню на вугальнай шахце падавалася перагрэтая пара. А ў Грузіі наведаў лазню турэцкую. Але нічога лепшага за нашы ўсё ж не сустракаў. Гэта цяпер задаюцца пытаннем: «Лазня? А навошта, у нас дома ванна». У маім дзяцінстве такога выбару не было. Дзякуючы гэтаму і ўцягнуўся. Ды так, што лазня стала часткай майго жыцця. Гэта ж азначае не толькі памыцца. А яшчэ і пагутарыць з сябрамі, і песні паспяваць... І таму лазневы дзень для нас — як свята.

Кожны парыльшчык выступаў дуэтам з мадэллю. У ролі апошняй для Арнольда Пятрова пагадзіўся стаць яго сябар яшчэ са школьных часоў, з якім ён часта ходзіць папарыцца.

На выступленне кожнаму ўдзельніку адводзілася паўгадзіны. За гэты час ён мусіў падрыхтаваць парылку, прадставіць сябе і лазневую праграму, папарыць напарніка ў адпаведнасці з заяўленай праграмай і падвесці вынікі. Для ацэнкі майстэрства парыльшчыка журы спатрэбілася ажно 12 крытэрыяў! Гэта знешні выгляд, прэзентацыя, тэхніка работы венікам, аўтарскае майстэрства, бяспека мадэлі, парыльшчыка, масажныя тэхнікі, работа з парай...

— Але як ацаніць адчуванні чалавека, які ляжыць пад лазневым венікам? — задаецца пытаннем **суддзя Уладзімір ВЕЯЛКІН**, які займаецца лазневым майстэрствам больш за трыццаць гадоў. — Бо асноўная мэта парыльшчыка — гэта даставіць задавальненне таму, каго ён парыць.

Чэмпіянаты па паранні ў лазні праходзяць у краінах Балтыі, Расіі, ва Украіне. А вось у Беларусі чагосьці падобнага дагэтуль не было. Хоць нашы парыльшчыкі ездзілі ажно на пяць спаборніцтваў у сумежныя краіны. З чатырох з іх вярнуліся з медалямі: двума сярэбранымі і двума бронзавымі.

— Адметнасць нашага чэмпіянату ў тым, што сёлета ў ім удзельнічаюць выключна аматары, — расказаў **суддзя міжнароднай катэгорыі па лазневым майстэрстве, бронзавы прызёр 3-га міжнароднага чэмпіянату па паранні, арганізатар лазневых фестываляў Генадзь МАРОЗ**. — У кожнага з іх ёсць свая філасофія лазні. Яна заключаецца ў тым, як чалавек ставіцца да гэтага працэсу, чалавека, якога ён парыць, што ён укладвае ў гэты працэс... Запрасіць прафесійных лазеншчыкаў мяркуем наступны раз. Чэмпіянат праводзіцца па стандартах Міжнародных асацыяцый лазневага майстэрства, спартыўнага парання. Так мы адначасова закладваем глебу і для сусветных спаборніцтваў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# ЛЁГКАЯ ПА́РА МАРОЗА

## Прафесійны парыльшчык пра тое, як правільна будаваць і прымаць лазню

**Такое адчуванне, што Генадзь Мароз, арганізатар лазеннага чэмпіянату, ведае пра лазню ўсё. Што прыемна, з задавальненнем дзеліцца сваім досведам. Кажа, што адзін усіх не папарыць. А так хочацца, каб як мага больш людзей адчула на сабе, што такое правільная лазня.**



***— Генадзь, сёння вы па-майстэрску дырыжыруеце венікамі. А памятаеце той дзень, калі ўпершыню ўзялі ў рукі інструмент парыльшчыка?***

— Калі вярнуўся з арміі, я працаваў у сферы дрэваапрацоўкі. Як правіла, па чацвяргах пасля змены хадзілі з калегамі ў лазню. Сярод нас быў хлопец, які займаўся барацьбой. Ён нас парыў так, як вучыў трэнер. Аднойчы я таксама ўзяў у рукі венік: гэта была чыстай вады імправізацыя. Але сябрам спадабалася. З тых часоў з венікамі практычна не расстаюся.

***— Самі іх нарыхтоўваеце?***

— Я, як максімаліст, люблю, калі ўсё зроблена прыгожа і правільна. Даўным-даўно навучыўся вязаць венікі. Праводжу майстар-класы для ахвотных. Але ж у мяне на сезон ідзе дзесьці 1500—2000 венікаў. Я не завяжу столькі сам. Ды і летам хапае ўсялякіх іншых спраў. Ёсць людзі, якія прафесійна займаюцца гэтым. Я паказаў ім, якія мне венікі патрэбныя. Дык яны мне ўжо шмат гадоў іх і пастаўляюць.

***— Як гэта: парыцца па-беларуску?***

— Калі казаць пра беларускую традыцыю парання, якую я актыўна адраджаю, то... Нашы продкі аддавалі перавагу бярозавым венікам. Таму што падчас парання выкарыстоўвалася пераважна не ўдарная тэхніка, а так званая націрка — масажныя, праціраючыя рухі. Таксама нашы продкі верылі ў Лазенніка — духа, які жыве ў лазні.

***— Большасць мужчын не ўяўляюць лазню без піва. Вы ж, наколькі я ведаю, прапагандуеце толькі лёгкую пару без ніякіх застолляў...***

— Людзі едуць да мяне па здароўе. Часам навічкі прывозяць піва, гарэлку, дарагі віскі, але ўсё забіраюць назад. У правільнай лазні хочацца толькі гарбаты, мёду, сухафруктаў.

***— З чаго пачынаецца лазня?***

— З думкі: «Трэба пайсці ў лазню».

***— Як часта павінна ўзнікаць такая думка?***

— Як мінімум раз на тыдзень. Перазаймаюся ў спартзале, замачыў ногі, на працы непрыемнасць, сын разбіў любімы кубак, жыццё дало трэшчыну — ідзі ў лазню. І ты ўбачыш, што ўсё не так страшна, як падавалася. Лазня ачышчае ад негатыву. Дапамагае адчуць сябе.

***— Ці праўда, што ў парылцы можна пахудзець?***

— І пахудзець, і пазбавіцца ад прастуды... Лазня стымулюе абменныя працэсы ў арганізме, павышае імунітэт.

***— Чым адрозніваецца жаночая лазня ад мужчынскай?***

— У парной няма полу, а да лазеншчыка прыходзяць як да лекара. Таму, калі навічкі ў мяне пытаюцца, што ўзяць з сабой у лазню, кажу: шапку, тапкі, ручнік, прасцінку. «А душ-гель? А купальнік?» Вы ж не ў басейн ідзяце, не на пляж? Лазня настолькі ачышчае венічкам і вадой, што чалавек сам пасля разумее, што гэта лішняе. Наогул я супраць плавак і купальнікаў у лазні. Калі цела пераціснута рызінкамі, гэта як калі едзеш па добрай дарозе на хуткасці — і раптам ляжачы паліцэйскі. Трэба, каб лімфа, кроў, энергія бегалі вольна. Толькі тады можна дасягнуць патрэбнага эфекту.

***— Мае сябры пабудавалі дом за горадам. Цяпер мараць пра лазню. Якіх памылак галоўнае не дапусціць?***

— У нас моцныя традыцыі саўнабудавання. А гэта ў першую чаргу нязручныя вузкія палкі. Куратнік зробяць, не папарыць, не папарыцца... Палок павінен быць шырынёй не менш за 80 сантыметраў. Бо ў лазні трэба ляжаць, а не сядзець. Інакш ногі будуць у прахалодзе, а галаве — спякотна. А павінна быць наадварот.

Яшчэ ў парылцы абавязкова павінна быць акенца. Бо самае галоўнае ў лазні — свежае паветра. Парную трэба перад кожны заходам праветрываць. Інакш мы будзем дыхаць тым паветрам, якое выдыхнулі, потам.

***— А што параіце аматарам-парыльшчыкам, якія ўжо маюць сваю лазню побач з домам?***

— Вялікае адкрыццё для людзей, калі я кажу пра венікі... «Ну, давай, Пятровіч, кладзіся, я цябе папару». Пятровіч лёг. І Іванавіч пачынае яго парыць. Дык вось, калі Іванавіч пакладзе Пятровічу пад твар халодны венічак, каб не ляжаў на голых дошках, і яшчэ другім венічкам накрые зверху... Розніца адчувальная! Так адразу лёгка дыхаецца прахалодай. Без венікаў доўга складана праляжаць.

Мала хто ведае, што пачынаць парыць чалавека трэба са ступняў. Менавіта там знаходзяцца ўсе актыўныя кропкі, сувязь з унутранымі органамі. Так адбываецца падрыхтоўка сардэчна-сасудзістай сістэмы да лазневых працэдур.

Ні ў якім разе не ліце эфірны алей на камяні і ў ваду для камянёў. Бо вада выпараецца і алей пачынае гарэць. У выніку вы дыхаеце канцэрагенамі.

У лазні трэба шмат піць. Я толькі за вечар выпіваю 3—4 літры вады. Вада ачышчае, абараняе ад уздзеяння тэмпературы, ад перагрэву.

***— Генадзь, магчыма, у вас ёсць нейкая мара, звязаная з папулярызацыяй лазеннай культуры?***

— Мару пра ўласную лазню. Яна будзе найлепшая ў свеце. Найлепшая для мяне. Камусьці там не хопіць більярднага стала, тэлевізара... У пакоі адпачынку замест скуранай канапы з чырвонымі ліхтарамі будзе сена, на якім людзі змогуць ляжаць і ўдыхаць водар. Людзі ў маёй лазні змогуць не толькі папарыцца, але і навучыцца правільна яе будаваць і прымаць. Я з задавальненнем дзялюся і буду дзяліцца сваім досведам. Мару, каб у беларускай лазні з'явіўся імідж у свеце, каб прафесійных парыльшчыкаў у нас стала больш. Менавіта для таго, каб папулярызаваць лазенную культуру, мы і правялі першы чэмпіянат па паранні. Пакуль што для аматараў. Спадзяюся, што ён стане традыцыйным.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*